Унікальнымі старонкамі ў спадчыне М.Танка бачацца "Лісткі календара", якія былі апублікаваны толькі ў 1970 годзе, а таксама "Дзённікі", якія зараз друкуюцца ў часопісе "Полымя". І тут перад намі паўстае творца, паэт, але не той, які сядзіць у вежы са слановай косці, а жывы, дзейны, заглыблены ў жыццё чалавек. Пражытыя гады дазволілі яму добра разгледзець, як дэвальваваліся знешне нібыта прывабныя камуністычныя ідэі, як бяздарна ўвасабляліся яны ў жыцці, як скоўваў усё жывое і разумнае ў грамадстве таталітарызм. Апалагетам былога і сённяшняга аўтакратычнага ладу жыцця, рэаніматарам савецкай імперыі і ініцыятарам нейкага новага дзяржаўнага ўтварэння шляхам зліцця Беларусі з Расіяй, якія спрабуюць выставіць асобу Максіма Танка як шчыт: "Ён з намі!", трэба азнаёміцца з запісамі паэта, зробленымі задоўга да перабудовачнай і цяперашняй мітусні: *"Прачытаў даклад М.А.Суслава. Усё больш становяцца для мяне незразумелымі адносіны нашых ідэолагаў да спраў культуры. Быццам на свеце не адбылося ніякіх змен, ніякіх пераацэнак..."; "Усіх нас ахапіў вірус пустапарожняй балбатні, ад якой можна ўпасці ў адчай і дэпрэсію"; "Чорт ведае, што атрымліваецца ў нас з уборкай. І гэта кожны год, нат пры самым лепшым надвор'і"; "Відаць, пакуль не стане ўсім відочны абсурд нашых пустазвонных пасяджэнняў, нам не ўдасца іх спыніць. А колькі людзей усё гэта адрывае ад працы, колькі марнуецца часу, сродкаў. Аж страх падумаць"; "Не ведаю, ці ўдасца нам, так працуючы, пабудаваць камунізм. Нідзе на свеце не бачыў такога марнатраўства часу".* І гэта вытрымкі толькі з невялічкай часткі "Дзённікаў"! Пастаянна ў запісах паўтараецца крык душы паэта: *"Бяда — няма калі пісаць. А для мяне не пісаць — тое самае, што не дыхаць".* Чалавек, які высока цаніў любую талковую, прафесіянальна выкананую працу, сам нястомны сейбіт на паэтычных загонах, Максім Танк не толькі маральна, але і фізічна задыхаўся ў атмасферы балбатні, фарысейства, фальшу, хлусні. Пішу гэтыя радкі і з добрай усмешкаю згадваю, як ён і ў прэзідыумах жыў вершамі. Дакладчык і выступоўцы мянташаць языкамі, таўкуць ваду ў ступе, а паэт, заглыблены ў сябе, думае, варушыць вуснамі...

Узіраючыся ў жыццёвы шлях паэта, і, можа, найпільней у апошнія дні, а я наведваў самотную, асірацелую танкаўскую кватэру, калі не стала ягонай вернай і адданай спадарожніцы па жыцці — жонкі Любові Андрэеўны, калі сам ён цяжка хварэў, думаецца пра многае. Не, не такія павінны быць адносіны дзяржавы да нацыянальнай эліты, да незвычайна таленавітых людзей, якіх заўсёды не так ужо і шмат у грамадстве. Ёй неабходна ствараць усе ўмовы, каб іх творчы патэнцыял раскрываўся поўна, да канца, каб гэтаму не перашкаджалі нейкія неістотныя праблемы, клопаты, дробязі. Ды, па ўсім відаць, такога ў бліжэйшай перспектыве чакаць не даводзіцца.

Аднак насуперак усім нягодам у нас ёсць неўміручая паэзія Максіма Танка. І ў гэты пагодлівы вераснёўскі дзень радасна чытаць ягоныя маладыя, мною любімыя, такія цудадзейныя радкі:

За шэрым схіленым парканам
Скрыпіць пясок сырых дарог,
Спадае медны ліст каштанаў
На жоўты стоптаны мурог.

Ідзеш, яго рукамі ловіш, —
Злавіўшы, пусціш, хай ляціць, —
Зноў не шумець яму ў дуброве,
Вясенніх шолахаў не піць.

І сумаваць яшчэ так рана,
Калі ўдаль маніць сцежак гладзь,
Калі на шум лясны ў тумане
Умееш песняй адказаць,

Калі так хочацца смяяцца,
Што бачыш ты і чуеш ты,
Як ціха сыплюцца праз пальцы
Каштанаў звонкія лісты.

Максім Танк быў і душэўна, і духоўна, і сваёй паставаю надзвычай прыгожым чалавекам. Усім гэтым надзялілі яго бацькі, родная зямля. Нядаўна мне давялося пабыць на Мядзельшчыне, пакланіцца яго магіле. Радасна ўсведамляць, што там, на малой радзіме, і кіраўніцтва раёна, і супрацоўнікі аддзела культуры, і бібліятэкары, і музейныя работнікі, і настаўнікі, і ўсе добрыя людзі клапатліва шануюць памяць і літаратурную спадчыну свайго слаўнага земляка. Сардэчны дзякуй ім!

Парадавала і тое, што на радзіме вялікага паэта вольна і хараша гучыць наша мова.

А сам Максім Танк сказаў так: *"Падарожнічаючы па розных краінах, я вынес глыбокае перакананне: на зямлі, апрача дрэў, траў і кветак, усюды растуць і вершы. Я іх знаходзіў на ўсіх сваіх шляхах, на ўсіх кантынентах. Але самыя светлыя, самыя лепшыя я знаходзіў толькі на роднай зямлі".*

Максім ТАНК

Родная мова

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Няма на зямлі таго шчасця і гора,
Якога б ты нам перадаць не магла.
Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму, туды, дзе сягоння
Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,
Над будучыняй і над песняй маёй, —
Над тым, што было і што век будзе вольным.

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.
Калі ж ападзе і развеецца дым
І нівы васкросшыя закаласяцца, —
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.
1943

* * *

Добры з ваўка музыка,
Ды не скакаць пад выццё;
Добры чарпак з рэшата,
Ды толькі з яго не піццё;
Добры мёд на памінках,
Толькі ніхто не пяе;
Добры рубель пазычаны,
Толькі спаць не дае;
Добры кажух са спагады,
Толькі сцюдзёна ў ім;
Добры агонь на чужыне,
Толькі грызе вочы дым.
1967.

Калі трэба была песня

Калі трэба была песня —
Ні ў чые не грукаў дзверы.
Я яе знаходзіў дома,
Як пад лаваю сякеру,
Як у прыпечку — цяпельца,
У сальніцы — жменю солі,
На дрывотні — кій дарожны,
Жаўрука — на родным полі.
А калі зноў песні буду
Я патрэбны, добра знаю:
Мяне знойдзе яна ў хаце
Ўтым жа нарачанскім краі
Ці за плугам, ці ў дарозе,
Ці ў дуброве рана-рана,
А не знойдзе — хай пакліча.
Я і з-пад кургана ўстану.
1972.

* * *

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
— Што самае цяжкое
На гэтым свеце?

І ён адказаў:
— Прайсці праз вернасць.
1976.



Максім Танк на Нарачы.
(Здымак да гадавіны паэта газеце "Народная воля" прапанаваў Віктар Жук.)

Лісты Максіма Танка да Пімена Панчанкі*

Мінск. 17.XI.1944

Дарагі мой дружа Пімен! Даўно я табе не пісаў. Перадусім, я да гэтага часу не атрымаў ад цябе адказу на сваю паштоўку, ды, прызнацца, і часу не было, каб засесці і ўпарадкаваць свае думы, бо ўвесь час знаходзіўся ў камандзіроўцы. Доўга мы тады вандравалі з сем'ямі дамоў. Амаль цэлы тыдзень ехалі з Масквы. Пазней Лынькоў, Куляшоў і я ездзілі на другі беларускі фронт, куды нас запрасілі, каб мы памаглі напісаць кнігу аб адной арміі п.з. "Беларускі паход". Апрача нас, беларусаў, былі масквічы Антакольскі, Бэк, Герасімава, Юфід і Вінаградская. Шмат пабачылі цікавага і новага. Праездам я затрымаўся ў Беластоку. Цэнтр горада зусім разбураны. Палац спалены. Тэатр пашкоджаны і зусім знішчаны заводы. Моцна разбурана, аж да маста, Ленінская вуліца. Нейкім цудам ацалеў наш Саюз пісьменнікаў, касцёлы, ЦДКА. Гасцініца згарэла. Там, дзе жыў я, было гета. Я ледзь прабраўся праз руіны на сваю вуліцу. Дом цэлы. Я зайшоў у дварышча. У пакоі размясціліся нашы байцы. Іграў патэфон і нехта танцаваў. З маіх рэчаў нічога не ацалела. Панурае ўражанне пакідае гэты горад. На вуліцы польскія патрулі. Усё дорага. Думаў я схадзіць з хлопцамі ў госці да пана ваяводы ўзяць інтэрв'ю, ды часу не хапіла. Ехалі мы ў адзін і ў другі бок на машыне. Бачылі ўсю Беларусь. Страх як усё разбурана. Прыехаўшы ў Мінск, сустрэўся з Таўлаем і Смолярам. Таўлай увесь час працаваў у партызанскай разведцы. Шмат цікавага апавядаў. Сам ён, здаецца, будзе працаваць у Купалаўскім музеі, а Смоляр, магчыма што, будзе сакратаром у нашым саюзе пісьменнікаў. Прыязджаў з Вільні мастак Пётр Сергіевіч. Быў ён на прыёме ў т.Панамарэнкі, які запрапанаваў яму пераехаць і працаваць у Мінску. Праз некалькі дзён, пасля прыезду з фронту, мы неспадзявана зноў выехалі ў камандзіроўку. Панцеляймон Кандрацевіч з усёй сваёй гвардыяй забраў і нас, пісьменнікаў, якія ў той час былі ў Мінску (Кандрат, Лынькоў, Куляшоў, Пястрак, Машара і я), выехаў за лінію Керзона вырашаць гранічныя нашы справы з палякамі. Да першага лютага, згодна ўмовы, палякам і беларусам можна пераязджаць з чужой тэрыторыі на сваю. У раёне Бельска, куды мы ездзілі, шмат беларусаў знайшлося па той бок лініі Керзона. Вось мы і ездзілі іх падымаць. Нялёгкая гэта справа. Людзі з дзядоў і прадзедаў жылі на гэтай зямлі, не вераць, што яны знайшліся за граніцай, не хочуць заставацца пад Польшчай, але цяжка ім і расстацца з сваімі гнёздамі. Мы былі ў раёне Белавежы. Там сапраўды вёскі чыста беларускія, аж крыўдна на гэтага Керзона, які хіба, калі праводзіў сваю лінію, і не ўяўляў, дзе жывуць палякі, а дзе беларусы. Шмат дзе сяляне пішуць пісьмы да таварыша Сталіна, каб ён перанёс граніцу далей на Захад. Ну, але, як яно ёсць, так і ёсць. Галоўнае — вырашаецца пытанне нашых заходніх граніц з палякамі, і, хіба што, назаўсёды. Сёлета ў гэтых ваколіцах была цудоўная восень.

Часамі, едзеш сотні кіламетраў па дарозе, абсаджанай бярозамі, клёнамі, вербамі. Следам з-пад калёс толькі ўзлятае залатая завея лісця. Такіх дарог, як у нас на Беларусі, асабліва на захадзе, мне рэдка дзе прыходзілася сустракаць. Нават Ты іх мала ведаеш. Як прыедзеш, яшчэ мы мусім з табой абысці іх усе, каб ні аднэй не засталося нязведанай, не апетай намі. Вярнуўся я крыху хворым. Відаць, прамерз. Трэці дзень сяджу дома. Напісаў нейкі даўгі верш. Мару аб паэме, аб сустрэчы з табой, а за вакном такі шалёны вецер і такі снег, што і выходзіць страшна. Сёння наведалі мяне Лынькоў і Крапіва. Выпілі крыху гарэлкі, пагутарылі пра сяброў і пра цябе. На днях Панцеляймон Кандратавіч казаў, што падпісаў указ аб узнагароджанні нас, пісьменнікаў, партызанскімі медалямі. І так, віншую, Брат, цябе з гэтай дарагой для нас, усіх беларусаў, узнагародай. Узнагародзілі нас па спіску арганізатараў партызанскага руху. Бачыш, якія весткі з Бацькаўшчыны. Толькі пішы часцей. Як чуешся здароўем, як заехаў, якія пішаш вершы. Прышлі штонебудзь з свайго "прекрасного далека". Шчырае прывітанне табе ад жонкі і нават ад майго малога Максіма. Моцна цісну тваю руку і абдымаю цябе з надзеяй на хуткую сустрэчу дома.

Мінск. 30.VII.45

Дарагі мой дружа Пімен!

Атрымаў тваё апошняе пісьмо, якое прычытаў Любе. Прывітанне табе ад яе. Асабліва ёй спадабалася тое месца, дзе ты пішаш пра дысцыпліну сямейнага чалавека, якая пануе ў маім доме і на стражы якой стаіць яна. Усё гэта не так страшна. Што да маіх паездак, дык мне здаецца, што я ніколі так шмат не ездзіў, як гэтыя часы. Пасля паездкі на Нарач (быў там з Лужаніным) быў у якасці дэлегата ад нашай рэспублікі ў 5-ую гадавіну Эстонскай ССР, у гасцях у латышоў, і зараз зноў збіраемся пад'ехаць у Брэст. А калі прыедзеш ты, разам паедзем вандраваць па нашай бацькаўшчыне. Нават да твайго прыезду падрыхтаваў бутлю на 6—7 літраў з спецыяльнай настойкай. Тут цябе збіраюцца і сустрэць, і жаніць. Вершы твае ўсе перадаў у "Полымя". Добрыя вершы. Ты молішся, каб хутчэй прыехаць дамоў, ды і мы ўсе за табой засумавалі. Толькі мне здаецца, што паўдзённае сонца і туга за бацькаўшчынай апалілі цябе, як апальваюць часам гліну ці фарфор на гарачым агні, надаючы ім празрыстасць і звон. Хай жа будзе блаславеннай і тая чужая зямля, на якой з'явіліся гэтыя добрыя вершы.

Я цяпер мала працую, ды і часу няма. Думаем выпускаць замест агітплаката журнал, тыпу "Крокодила", які ахрысцілі "Вожыкам". Сёння ў мяне быў Міхаіл Ціханавіч, які пару тыдняў таму, як прыехаў з Сан-Францыска. Шмат апавядае цікавага. Але зараз праклінае Амерыку, бо амаль кожны дзень яго цягаюць рабіць даклады, дзяліцца ўражаннямі, пісаць артыкулы ў нашы газеты. Зараз за вярсту будзе абыходзіць людзей, якія пытаюцца ў яго: "Ну як там, у Сан-Францыска? Гэта, здаецца, на той старане зямлі, і вы хадзілі дагары нагамі?" і г.д. і г.д. Як прыедзеш, не пытай пра Амерыку. Перасылаю табе адзін з сваіх апошніх вершаў. [...]

Моцна цісну тваю руку. Прывітанне ад усіх нас, ад усіх тваіх знаёмых і сяброў — Максім Танк.

Падрыхтоўка да друку і публікацыя З.К.ПАНЧАНКА.

*

** Пімен Панчанка ў гэты час (1944—1945) знаходзіўся ў Іране з часцямі Чырвонай Арміі.*

Спорт

Французский бастион оказался неприступным для поляков. И не только...

Недавно в Турции завершился чемпионат мира по гандболу среди юниоров (до 21 года), где участие принимала и наша сборная.

Жребий распределил белорусов в группу "D", вместе с командами Дании, Германии, Египта и Греции. Для выхода в 1/8 финала требовалось занять любое место, кроме последнего.

Первый матч наша дружина проводила со сверстниками из Египта. На протяжении всего матча белорусы контролировали ход игры, египтяне ничего не смогли противопоставить нашей сборной, и поэтому у белорусов заслуженная победа — 32:29.

В следующем матче пришлось держать экзамен против прошлогодних чемпионов мира — датчан. Экзамен был полностью завален, "датская машина" не дала сбоя. Как ни пытались наши ребята зацепиться за счет, сыграть на равных с датчанами не удалось, и в итоге сокрушительное поражение — 31:19.

После такого финала белорусов ждала несильная сборная Греции. Практически все заранее отдавали победу белорусам. Однако наши ребята, выйдя на площадку, видно, забыли, что перед ними не чемпионы-датчане, а "всего лишь" греки. Сборная Греции играла грамотно (даже в обороне!), стараясь забрасывать в каждой атаке. Белорусы тем временем транжирили голевые моменты, что называется, налево и направо. Результат этого — ничья с аутсайдером группы 23:23.

А в конце турнирной борьбы нашу команду поджидала сильная сборная Германии. Белорусы, получив хороший урок в матче с датчанами, вышли на площадку с желанием сыграть достойно. Все получалось у наших ребят хорошо, но в конце 1-го тайма немцы, ускорив темп, ушли на перерыв с разницей в 5 мячей. Подарок с неба упал белорусской команде в конце матча, когда, сократив отставание до 4 мячей, наша сборная продолжила игру с количественным перевесом: 6 против 4. Но, к сожалению, белорусы этим подарком воспользоваться не смогли и проиграли (28:34).

В результате наша команда заняла 3-е место, пропустив вперед сборные Дании и Германии.

Нашим соперником в 1/8 финала стала сборная Франции, занявшая 2-е место в группе "С". Предпочтение в этом матче практически полностью все отдавали более сильным французам. Однако гандболисты Беларуси не падали духом и решили показать всему миру, что такое гандбол в "белорусском варианте".

Действительно, матч получился захватывающим, впервые на турнире надежно действовала белорусская оборона и вратари, а на острие атак блистал выступающий за минский "СКА" Владимир Наганов. К слову, Володя забросил в этой игре 12 мячей, почти половину заброшенных командой в сумме. Из 4 семиметровых назначенных в наши ворота, французами не было заброшено ни одного.

Весь матч прошел в напряжении, белорусы часто вели в счете, однако в последней пятиминутке "подсели", сбавили обороты. Чем сразу же воспользовались французы, склонив чашу весов, на которых находилась победа, в свою сторону. 27:26 — и французы в 1/4 финала, а белорусы, заняв 14-е место на чемпионате среди 20 команд, сошли с дистанции.

Чемпионами мира вновь, как и в том году, стали датчане, в финале разобравшись с гандболистами Украины — 29:23. 3-е место завоевали французы, одолев (28:24) дружину с Польши.

Алексей ЖУРАВЕЛЬ.

Дзень у гісторыі

17 верасня

У 1657 г. нарадзілася царэўна Соф'я, дачка цара Аляксея Міхайлавіча і яго першай жонкі, правіцельніца расійскай дзяржавы ў 1682—1689 гг. Царэўна Соф'я атрымала адукацыю ў Сімяона Полацкага, знакамітага асветніка, грамадскага дзеяча і паэта з Беларусі. У 1689 г., калі ў барацьбе за трон перамог падрослы Пётр І, Соф'я Аляксееўна была пасаджана ў манастыр.

У 1789 г. у Філадэльфіі была прынята Канстытуцыя ЗША, а 55 удзельнікаў Канстытуцыйнага канвента з тых часоў звычайна называюць "бацькамі-заснавальнікамі".

У 1912 г. нарадзіўся Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко), народны паэт Беларусі. Акрамя псеўданіма "Танк", які трывала замацаваўся за ім, паэт напачатку сваёй творчасці карыстаўся яшчэ псеўданімамі Бура, Граніт, Сівер, Віктар (усе даволі "суровыя", "мужныя" словы, звязаныя з барацьбой). Як помнім, іншыя вядомыя пісьменнікі бралі тады псеўданімы Бедны, Бядуля, Гаротны, Бяздольны...

У гэты ж дзень у 1922 г. нарадзіўся Уладзімір Калеснік, беларускі крытык і празаік, даследчык творчасці Танка і ўвогуле грамадска-палітычнага і літаратурнага жыцця Заходняй Беларусі (кнігі "Паэзія змагання", "Максім Танк" і інш.).

У 1922 г. нарадзіўся Агасціньё Нэта, першы прэзідэнт Народнай Рэспублікі Ангола.

У 1939 г. войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу (пасля нападу Германіі польскі ўрад фактычна кінуў краіну на волю лёсу) — і да 25 верасня занялі ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Меркавалася, што 12 млн. чалавек такім чынам былі вызвалены ад заняволення "панамі" і фашыстамі. Але гісторыя аказалася больш жорсткай...

У 1957 г. на Украіне пачаўся Тыдзень беларускай літаратуры. Павезлі паказаць суседзям, што і наш квасок не з трасок!

У 1960 г. адбылася юбілейная 400-я пастаноўка камедыі Я.Купалы "Паўлінка" ў Беларускім дзяржаўным тэатры імя Янкі Купалы.

Зміцер ВІШНЁЎ

Віншуем!

Беларускія барцы адзначаны "серабром"

Да фінальнай схваткі паспяхова ішоў беларускі атлет Анатоль Федарэнка, які выступаў на праведзеным у Польшчы чэмпіянаце свету па грэка-рымскай барацьбе. А вось у заключным паядынку супраць масквіча Гогі Кагуашвілі (вага 97 кг) гродзенскі спартсмен стушаваў, прайграўшы яму па ачках з лікам 0:6. Прычым усё гэта адбывалася ў партэры, калі сапернік правёў запар некалькі накатаў.

Астатнія беларускія "класікі" ў фінал не трапілі. Бліжэй за іншых быў да яго бронзавы прызёр Алімпіяды ў Атланце Валерый Цыленьць (85 кг), але ў паўфінале яго абышоў адзін з мацнейшых атлетаў свету турак Хамза Верлікая. Не пашанцавала і нашаму суперцяжкавагавіку Сяргею Сілічу. Ён прайграў дзве схваткі, што і пазбавіла яго права змагацца за ўзнагароды. А перамог тут славуты сібірак Аляксандр Карэлін, які вось ужо многія гады не ведае паражэнняў на ўсіх буйнейшых барцоўскіх турнірах.

Вячаслаў ДУТАЎ
БелТА.

ШАХМАТЫ

Из шахматной классики

С.Лойд



Белые: Крh4, Фe5, Кf3, Кg5(4).
Черные: Крh6, Ла8, Сb1, пп. g4, g6, g7(6).

Мат в 3 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахмат трехходовую задачу выдающегося американского шахматного композитора Сэмюэля Лойда. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте в редакцию.

Турнир в Алуште

В Международном шахматном турнире, проходившем в Алуште (Крым), приняло участие 10 шахматистов, среди которых было 3 международных гроссмейстера. Достаточно высок был и средний рейтинг турнира — 2450. В напряженной борьбе победителем турнира стал россиянин, международный мастер Евгений Прокопчук. Набрав 7 очков из 9 возможных, он опередил всех конкурентов и заодно выполнил гроссмейстерскую норму. На полтора очка от победителя отстал международный мастер из Украины Олег Эйсмонт. Витеблянин, международный гроссмейстер Андрей Ковалев набрал 5 очков и разделил 3—5 места с гроссмейстером Михаилом Голубевым и международным мастером Валерием Роговским (Украина).

С улыбкой

В 1910 году в Гамбурге проводился большой Международный шахматный турнир. Перед началом его известный гроссмейстер З.Тарраш выступил против участия в турнире мастера Ятса, мотивируя это тем, что последний слишком слабый шахматист. Как показали дальнейшие события, прогноз Тарраша оказался точным. Ятс действительно занял последнее место, проиграв почти все партии. За исключением одной. Единственную свою победу Ятс одержал над... Таррашем.


* * *

Однажды Э.Ласкер и Г.Мароци давали альтернативный сеанс одновременной игры на 23 досках в лондонском "Дамском шахматном клубе". Неожиданно для публики многие партии завершились вничью. Вину за это Ласкер возложил на своего коллегу — изысканные манеры не позволяли венгерскому гроссмейстеру отвергать ничью, предложенную дамой.

ШАШКИ

Концовки Л.Спружа

Кандидат в мастера спорта из Жодино Леонид Спруж представляет на суд любителей шашек нашей газеты две свои комбинационные концовки.



I. **Белые:** простые b2, c1, d4, d6, e5, f2, g3, h6(8).
Черные: простые a5, a7, b8, c7, f4, f6, f8, g7, h2(9).
II. **Белые:** простые a1, b4, c3, d2, d4, e3, g1, h2(8).
Черные: простые b6, c7, d6, e5, f2, f4, f6, g3, g5, g7(10).

Хотя начальная расстановка в каждой концовке далека от практической игры, тем не менее проводимые белыми при своей очереди хода комбинации представляют особый интерес для любителей шашечных комбинаций.

В первой позиции комбинация заканчивается темой "застава на тройнике", а во второй — белые своим финальным ударом сбивают сразу восемь черных единиц.

В обоих случаях в итоге проведенных комбинаций выигрыш белых не вызывает никаких сомнений.

Решения следует присылать по адресу: 220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а. "Шашки".

Проверьте решения

Приводим правильные решения позиций, которые были опубликованы в "НВ" от 2, 16, 23 и 30 июля с.г.

I. 1. a1-b2 c3:a1 2. e1:g7 a1:h8 3. h4:f6 h8:h2 (после 3. ...f2:h4 4. c7-b8 h8:c7 5. b8:f4, белые выигрывают) 4. c7-b8 h2:c7 5. b8:e1, снимая все черные шашки.

II. 1. e5-d6 c5:e7 2. g7-f8 b8:d6 3. f4-e5 d6:f4 4. f8:g3! h4:f2 5. h6:f4 e3:g5 6. c1:g1 g3-f4 7. g1-f2, и черным приходится сдаваться.

III. 1. a1-b2 c3:a1 2. e5:e1 a5:c3 3. g1-f2 e1:g3 4. g7-h8 a1:g7 5. h8:h2 b8-a7 6. h2-c7, и белая дамка выигрывает против двух простых черных.

IV. 1. h2-g3 f2:h4 (после 1. ...f4:h2 2. b6-c7 b8:d6 3. b4-c5 d6:b4 4. d2-c3 b4:d2 5. c1:g1, черная простая"h2" взаперти) 2. d2-e3 f4:d2 3. c1:e3 h4-g3 4. b4-c5 g3-h2 5. b6-a7 b8-c7 6. e3-d4 c7-b6 7. c5-d6 b6-a5 8. d6-e7 a5-b4 9. e7-f8 b4-a3 10. a7-b8 a3-b2 11. b8-g3 h2:f4 12. d4-e5 f4:d6 13. f8:c1, с выигрышем белых.

V. Добавить черную простую на "h4". 1. e1-d2 h4-g3 (на 1. ... a3-b2 следует 2. d2-c3 b2:d4 и 3. h2-g3) 2. h2:f4 a3-b2 3. d2-c3 b2:d4 4. f4-e5 d4:f6 5. g1-f2 f6-e5 6. f2-e3, и вновь белые выигрывают.

VI. Добавить черную простую на "h8". 1. b1-f8 g7-h6 2. e3-f4 h8-g7 3. f8-e7 g7-f6 4. e7-a3 f6:h4 5. a3-c1 h6:e3 6. c1:f4, и выигрыш.

VII. Партия далее продолжалась так: 1. a3-b4 c5:a3 2. f4-e5 d6:f4 3. e3:g5 h6:f4 4. g3:g7 h8:f6 5. d4-c5 b6:d4 6. c3:g7, и черные сдались.

Правильные решения этих позиций прислали: минчане Сергей Герасимчик, Иван Навроцкий и Сергей Леонович, Михаил Артишевский (г.Березино), Виктор Жуковский (г.Барань), Сергей Краило, Анатолий Кругельчук, Григорий Сидорчук (трое из Бреста).

Тридцать лет спустя

Июль 1967 года. В Калининграде (областном) проходит финал чемпионата Всесоюзного студенческого ДСО "Буревестник" по международным шашкам. Восемнадцать участников из России, Украины, Белоруссии, Узбекистана, Москвы и Ленинграда, из которых шестнадцать мастеров спорта и лишь два кандидата в мастера, ведут спор за награды.

Среди кандидатов и автор этих строк — в то время студент БГУ имени В.И.Ленина. Заветная норма мастера спорта в 9 очков из 17 казалась в таком сильном составе очень далека и вряд ли доступна. И тем не менее по прошествии турнира, который длился две с половиной недели, девять очков были набраны (4 выигрыша, 3 проигрыша, 10 ничьих).

А уже 22 сентября 1967 года приказом по Центральному совету Союза спортивных обществ и организаций СССР мне было присвоено звание мастера спорта СССР по шашкам.

Борис АГАШИН, мастер спорта.

Рецепты старины глубокой

Как сохранить яблоки

Снятые с деревьев яблоки укладывают в бочки рядами, полностью засыпая каждый ряд сухим песком, чтобы не допустить к яблокам воздух (это основное условие их сохранности) и остановить испарение влаги (для сохранения их запаха). Влага, которая все же испаряется из яблок, довольно быстро убирается песком. Яблоки, которые сохраняются этим способом, даже в мае и июне бывают такими свежими, что кажутся только что снятыми с яблони.

Самый простой способ засолки огурцов

Отберите огурцы одинакового размера, без изъянов, вымойте огурцы и зелень. Сложите в чистые трехлитровые банки и залейте раствором, приготовленным из 1,5 л воды и трех столовых ложек с верхом соли. Накройте чистой тряпочкой и поставьте на брожение на трое-четверо суток. Как только появится шапка пены с кислым запахом, а раствор помутнеет, слейте его в эмалированную кастрюлю, прокипятите и залейте кипящим раствором огурцы, тут же закатайте банки стерильными крышками. Перед закатыванием можно насыпать сверху на рассол 1/4 чайной ложки сухой горчицы.

Самый легкий способ стерилизации банок

Вымыть банки с мылом для обезжиривания (не используйте для этого соду — она всегда оставляет мутный осадок на стекле).

Затем хорошо ополосните холодной водой и поставьте горлышком на горловину чайника с кипящей водой. На носик чайника наденьте колпачок от водочной бутылки. Подержите каждую банку 8—10 минут. При таком способе не требуется большого количества воды и газа, что немаловажно в дачных условиях.

Самый оригинальный и быстрый способ пастеризации

Вместо того чтобы пастеризовать банки с консервами на водяной бане, делают следующее: на носик чайника надевают резиновую прокипяченную трубку, наливают в чайник воду, накрывают крышкой и ставят на огонь. Второй конец трубки опускают в банку с консервированными овощами. Когда вода в чайнике закипит, пар из трубки пройдет через овощи и их пастеризует. Достаточно 4—5 минут для пастеризации в банке емкостью 0,8—1,0 л.

Свои миллионы леди Ди завещала сыновьям

Принц Уильям и принц Генри, согласно воле их матери принцессы Дианы Уэльской, станут главными наследниками ее состояния, оцениваемого в 40 миллионов фунтов (65 миллионов долларов). В эту сумму входят и те 17 миллионов фунтов, которые были выплачены Диане при разводе с принцем Чарльзом. Коллекция драгоценностей (ее стоимость оценивается приблизительно в 16 млн. фунтов — примерно 26 млн. долларов), которые были подарены Диане по случаю обручения и свадьбы Елизаветой II, согласно условию, оговоренному при разводе, после смерти Дианы возвращаются в королевскую семью. Однако отдельные драгоценности, подаренные ей бывшим супругом, к примеру обручальное кольцо с сапфирами и изумрудами стоимостью в 28,5 тысяч фунтов (свыше 46 тысяч долларов), считаются собственностью Дианы. Что касается недвижимости, то ее у принцессы Уэльской не было. Кенсингтонский дворец был выделен королевой в пожизненное пользование, но собственностью Дианы не являлся. Принц Чарльз, вероятно, не захочет, чтобы в этом дворце после смерти матери жили его сыновья. И Уильям, и Генри теперь свои праздники и каникулы будут проводить в загородном отцовском имении Хайгроув, в графстве Глочестершир. Заботу о воспитании мальчиков разделят отец и няня. Скорее всего ею вновь станет обожаемая принцем Уильямом 31-летняя Тигги лигг-Броук, которая очень долго прожила в тесной близости к семье принцев Уэльских, пока тяжелейшие раздоры с Дианой, вызванные ревностью принцессы, не вынудили няню подать в отставку.

ТЕЛЕПРОГРАММА

Среда, 17 сентября

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 17.55 "Музыкальная обойма".
7.50 "Медитация". Док. фильм.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 24.00 Новости.
8.10 Бездельник.
8.40 Туробъектив.
9.00 ТВ — школе. Белорусская литература. 8-й класс. Евфросинья Полоцкая и ее жизнь.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 Мультфильм.
9.55 Телебом.
10.25 Компьютерный полигон.
10.50 "Берег его жизни". Худ. фильм. 3-я серия.
11.55 Видимо-невидимо.
15.15 "Приключения капитана Врунгеля". Мультфильмы 7—8-й.
15.35 "Эта надоедливая оса". Док. фильм.
16.10 "Навстречу". V Международный конкурс камерных ансамблей имени М.Огинского.
16.40 "Времена года художника Эдуарда Величко". Телеочерк.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Арсенал. Программа для армейцев.
18.15 "Берег его жизни". Худ. фильм. 3-я серия.
19.20 Тема дня.
19.40 Темная комната. "Достоверно".
20.05 Ток-шоу "Это моя работа". К Дню работников леса.
20.30 Авто-парк.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 "Криминальный талант". Худ. фильм. 2-я серия.
23.20 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.30 Новости.
8.15 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
9.00 Тема.
9.40 В мире животных.
10.20 Домашняя библиотека.
10.30 "Угадай мелодию". Телеигра.
14.20 "Драконы подземелий". Мультсериал.
14.45 Кактус и К.
14.55 До-ми-соль.
15.15 Зов джунглей.
15.40 "Гарри — снежный человек". Комедийный сериал.
16.05 ...До шестнадцати и старше.
16.30 Вокруг света.
17.20 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
18.05 Погода.
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию". Телеигра.
19.00 "В поисках утраченного". Сергей Мартинсон. Ведущий — Г.Скороходов.
19.45 Спокойной ночи, малыши!.
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 Сергей Мартинсон в фильме "Дядюшкин сон".
22.25 Тайны "Красной Капеллы" в документальном детективе "Неженская роль".
23.40 Программа передач.

Канал "Россия"

7.00, 10.00, 13.00,16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 "Ветер в спину". Телесериал (Канада).
8.15, 17.35 Наш Пушкин.
8.20 Лукоморье.
8.50, 9.30 Товары — почтой.
9.00 "Санта-Барбара". Сериал.
13.20 На заметку.
13.25 Деловой автограф.
13.30 Клавир.
13.45 "Похищение индианки". Худ. фильм.
15.10 Мир здоровья.
15.20 Мультфильм.
15.30 Лукоморье.
16.20 Православный календарь.
16.25 "Санта-Барбара". Сериал.
17.20 Это Москва.
17.40 История одного события.
17.55 "Ветер в спину". Телесериал (Канада).
19.35 Национальный интерес.
20.10 "Агенты КГБ тоже влюбляются". Худ. фильм (Россия — Чили).
22.15 Вовремя.
22.25 Добрый вечер.
23.10 Дежурная часть.
23.25 "Киношок-97".
23.40 Лестница в небо.
0.10 Телемагазин.

Санкт-Петербург

12.30, 15.30, 18.30, 21.30 Информ ТВ.
12.45 "Предчувствие убийства". Сериал (США). 1-я серия.
13.35 Срок ответа — сегодня.
14.05 Советы садоводам.
14.25, 15.55, 20.00 Телестанция "Моя Россия".
14.55 Папа, мама, я — спортивная семья.
15.40, 20.30 Телеслужба безопасности.
16.45 Конкур. Соревнования по конному спорту.
17.25 Телемагазин.
18.45 Спорт.
18.55 Большой фестиваль.
19.10 "Предчувствие убийства". Сериал (США). 1-я серия.
20.45 Поэзия. А.Фет.
20.50 Сокровища Петербурга. "Дом трех императриц".
21.00 Парадоксы истории. "Подложный сын, или Околдованный граф".
21.50 Спорт.
21.55 "Салют, Мария!" Худ. фильм (Россия). 2-я серия. ких глубин".

НТВ

5.00, 9.00 Сегодня утром.
8.05 Лучшие цирки мира. "Цирковые приключения". Часть 5-я.
9.15 Телеигра "Пойми меня".
9.50 Новости кино.
10.00 Лучшие цирки мира. "Цирковые приключения". Часть 6-я.
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
11.15 Жерар Депардье и Жан Рошфор в криминальной драме "Старший брат" (Франция).
13.20, 15.20 Финансы и бизнес.
13.30 Филипп Нуаре, Жан Рошфор и Джейн Биркин в детективе "Друг Венсана" (Франция).
15.30 Программа для детей "Улица Сезам".
16.00 Док. сериал. "XX век в войнах" (США). Фильм 20-й "Война в воздухе" (1939г. — 1945г.)
16.55 Криминал.
17.00 Впрок.
17.15 Дистанция.
17.45 Футбольный клуб.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.00 Луи де Фюнес и Жан Карме в комедии Жана Жиро "Суп с капустой" (Франция).
21.35 Футбол. Лига чемпионов. "Эйндховен" (Голландия) — "Динамо" (Киев).
23.30 Сегодня в полночь.
23.45 В печать.
0.05 Футбол. Лига чемпионов. Обзор матчей.
0.30 Психологическая драма "Страстное желание" (США).

ТВ-6 Москва

14.00 Программа передач.
14.05 Х/ф "Белый пароход".
15.50, 17.00 Телемагазин."Спасибо за покупку!"
16.05 Сериал для подростков "Флиппер".
16.35 Диск-канал.
17.10 Аптека.
17.20 Дорожный патруль.
17.35 Диск-канал.
18.20 Знак качества.
18.55, 20.05, 22.45 "Шесть новостей".
19.05 Ток-шоу "Я сама": "Я изменила... его привычкам".
20.20 Мелодрама "Танцы вслепую" (США).
22.15 Те Кто.
23.00 Дорожный патруль.
23.15 Диск-канал.
00.00 Знак качества.

8-й канал

18.00 Для детей "Пострелята".
18.30 Программа Кеннета Копланда.
19.00 Сериал "Русский транзит".
20.00 Аэробика "Новый Эдем".
20.30 Вечарніца.
20.45 Сериал "Горец".
21.45 Муз-парад.
22.00 Дин Стоквелл в худ. фильме "Унабомбер".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя адказнасці не нясе. Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ЗАТ "Летувас рытас". Адрас: г. Вільнюс, пр-т Гедыміна, 12а. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: першы завод —50200 экз. Заказ №2165